**Н. А. Гулак**

Кафедра рэжысуры, факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Мінск, Беларусь

УДК 398 (476):94 (470)"1945/1960"]:351.852

# ДАСЛЕДЧЫЯ ЗАДАЧЫ І ВОПЫТ БЕЛАРУСКАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ 1945–1960-Х ГГ.

На значным фактычным матэрыяле паказана праца савецкіх фалькларыстаў, устаноў навукі і культуры ў галіне збірання і вывучэння беларускай народнай творчасці. Даказана, што рэалізацыя даследчых задач была прадуктыўнай, абапіралася на шырокую сацыяльную базу і выходзіла за межы акадэмічнай навукі.

**Ключавыя словы**: фалькларыстыка, збіральніцкая дзейнасць, экспедыцыйныя матэрыялы, пашпартызацыя, культурны дыскурс.

**Узор цытавання**: *Гулак Н. А.* Беларуская фалькларыстыка 1945–1960-х гг.: даследчыя задачы і вопыт // София. 2019. № 2. С. 22–27.

**N. Hulak**

Department of directing of ceremonies and holidays, faculty of traditional Belarusian culture and contemporary art, Belarusian State University of Culture and Arts, Minsk, Belarus

# RESEARCH TASKS AND EXPERIENCE OF BELARUSIAN FOLKLORE IN 1945–1960

Based on a considerable amount of factual material, the article explores the work of Soviet researchers, science and cultural institutions in the field of collection and study of the Belarusian folklore. The work proves that the implementation of research tasks was productive, employed a broad social basis, and extended beyond the academic framework.



**Keywords**: folklore studies, collect, expedition materials, certification, cultural discourse.

**For citation**: Hulak, N. (2019). Research tasks and experience of Belarusian folklore in 1945–1960. *Sophia*, 2, 22–27 (in Belar.).

**Аўтар:**

**Настасся Анатольеўна Гулак** – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры рэжысуры факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва БДУКМ.
*rudolfina.hulak@tut.by*

**Author:**

**Nastassia Hulak** – PhD in philology, associate professor of the department of traditional Belarusian culture and contemporary art, BSUCA.

Даследчая дзейнасць беларускіх фалькларыстаў, якая разгортвалася ў 1945–1960-я гг., з'яўляецца ўнікальнай старонкай гісторыі беларускага народазнаўства XX ст. Разам з тым, у спецыяльнай літаратуры яна застаецца асветленай у самых агульных рысах, не ўзгадваецца пра яе ў комплексных даследаваннях па гісторыі Акадэміі навук БССР[1].

[1] Працы В. Ф. Купрэвіча, М. У. Токарава, П. Ц. Петрыкава, А. У. Лібезіна і інш.

У першыя пасляваенныя гады збіранне і вывучэнне ўзораў народнай творчасці вялося, па-сутнасці, невялікім колам даследчыкаў-энтузіястаў, дзеячаў культуры і службоўцаў, сярод якіх М. Грынблат, Л. Бараг, М. Меаровіч, Г. Цітовіч, Р. Шырма, Л. Мухарынская, І. Гутараў, Э. Галубок, М. Клімковіч, у складаных умовах разбуранай пасляваеннай гаспадаркі на фоне партыйна-дзяржаўнага кантролю, цэнзуры і ждანаўскіх ідэалагічных кампаній. У гэты час цэнтрам збірання фальклору быў сектар этнаграфіі і фальклору Інстытута гісторыі АН БССР[1], які разам з інстытутамі эканомікі і сельскай гаспадаркі аднавіў сваю працу адразу пасля вызвалення Мінска ў 1944 г. Інтэнсіўная збіральніцкая работа была распачата таксама ў Мінскім педагагічным інстытуце пад кіраўніцтвам Л. Барага і М. Меяровіч[2]. Кіраванне самадзейнай і аматарскай творчасцю на месцах ажыццяўлялі структуры Рэспубліканскага Дома народнай творчасці (РДНТ), аднак вынікі гэтай арганізацыйнай дзейнасці толькі часткова адпавядалі задачам акадэмічнай навукі.

Трэба адзначыць, што з канца 1930-х гг. у беларускай фалькларыстыцы сцвердзіўся метад сацыялістычнага рэалізму з яго ідэалагічнымі ўстаноўкамі на пошук і інтэрпрэтацыю тых узораў народнай творчасці, якія б найбольш эфектыўна рэпрэзентавалі сацыяльныя пераўтварэнні новай эпохі. У пасляваенны час такія задачы зрабіліся яшчэ больш актуальнымі.

22–26 красавіка 1945 г. на першай сесіі аддзялення грамадскіх навук Акадэміі навук БССР прагучаў даклад М. Грынблата аб задачах збірання і вывучэння фальклору Вялікай Айчыннай вайны, сярод якіх найважнейшай называлася задача аднаўлення даваеннай сеткі карэспандэнтаў-збіральнікаў. Практычна ў гэты час пачынаюцца фалькл͏орна-этнаграфічныя экспедыцыі супрацоўнікаў Акадэміі навук. За 1945–1946 гг., паведамляе часопіс «Весці АН БССР» (1947, № 1), экспедыцыі пад кіраўніцтвам М. Грынблата абследавалі раёны Цэнтральнай Беларусі і Заходняга Палесся і сабралі вельмі каштоўныя матэрыялы.

Важную сацыяльна-ідэалагічную ролю адыгрывала прадстаўніцтва беларускіх вучоных на мерапрыемствах саюзнага ўзроўню. Як сведчаць архіўныя даныя, у чэрвені 1946 г. у Маскве адбылася канферэнцыя па беларускаму і ўкраінскаму фальклору, даклады на якой рабілі М. Грынблат і Г. Цітовіч [6, л. 260]. З 25 сакавіка па 5 красавіка 1947 г. Усесаюзны Дом народнай творчасці ў Маскве праводзіў канферэнцыю-семінар фалькларыстаў, у якой бралі ўдзел вядучыя тагачасныя тэарэтыкі і практыкі: П. Багатыроў, К. Квітка, В. Крупянская, С. Мінц, Г. Руднева, У. Чычараў, Я. Гіпіус, Э. Памеранцава (Гофман), метадысты УДНТ, прадстаўнікі актыву збіральнікаў фальклору і ўдзельнікі Усесаюзнага конкурсу збіральнікаў. На канферэнцыі гучалі даклады, прысвечаныя самабытным з’явам народнай культуры, знаёмілі з таленавітымі выканаўцамі (сказіцелямі) і іх творамі. Беларускую навуку прадстаўлялі Г. Цітовіч з дакладам аб прынцыпах работы з народным хорам і М. Меаровіч з дакладам аб аўтарскай методыцы збіральніцкай работы [6, л. 310].

У снежні 1947 г. беларуская дэлегацыя ў складзе І. Гутарава, Л. Барага, М. Грынблата і Г. Цітовіча брала ўдзел ва Усесаюзнай нарадзе ў Інстытуце этнаграфіі АН СССР, прысвечанай народнай творчасці часоў Вялікай Айчыннай вайны. Разгорнутая справаздача па выніках гэтай нарады ў часопісе «Советская этнография» (1948, № 2),

[1] З 1957 г. – сектар фальклору Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР.

[2] У сакавіку 1949 г. беларускія даследчыкі Л. Бараг і М. Меяровіч былі рэпрэсаваныя па «справе касмапалітаў».

сведчыць, што праблема фальклору вайны асэнсоўвалася як цэнтральная і выключна важная ў тагачаснай навуцы і культурнай практыцы. Пры тым, што метадалогія фіксацыі і тэарэтычнага вывучэння фальклору вайны не стала ў фокусе ўвагі ўдзельнікаў гэтага прадстаўнічага форуму, фальклярысты БССР і іншых саюзных рэспублік атрымалі значны імпульс сваёй сацыяльнай актыўнасці.

На працягу 1948 г. спецыялісты Акадэміі навук і РДНТ удзельнічаюць у комплекснай экспедыцыі ў партызанскія раёны Магілёўскай і Гомельскай абласцей, выязджаюць у рэгіёны, дзе працуюць з носьбітамі, праводзяць семінары для метадыстаў і збіральнікаў, выступаюць з дакладамі.

У 1948 г. РДНТ мае большыя за акадэмічны інстытут матэрыяльныя рэсурсы. У плане навукова-выдавецкай дзейнасці гэтай установы стаіць выданне фальклорнага зборніка пра К. Заслонава, рэпертуарнага зборніка для мастацкай самадзейнасці, анталогіі фальклору на тры друкаваныя аркушы і інш. [6, л. 282–283]. Але многія з гэтых планаў засталіся нерэалізаванымі, бо тагачасная навука не валодала інструментарыем для ўсебаковага вывучэння фальклору вайны, была пазбаўлена аўтаноміі і ўключана ў парадыгму дзяржаўнай ідэалогіі.

Першай спробай навуковай рэпрэзентацыі партызанскай творчасці ў Беларусі стала кандыдацкая дысертацыя І. Гутарава «Партизанская война в народном творчестве» (1948). У ёй упершыню на беларускім матэрыяле было пастаўлена пытанне аб фальклярызацыі твораў прафесійнай літаратуры ў рэпертуары партызан. Сцверджаны тэзіс аб прадуктыўнасці дарэвалюцыйнай рэкруцкай песні і песень савецкага часу. І. Гутараў апісаў песні паланянак, прывёў значную колькасць народных пераладжэнняў «Катюши» і інш. [8, л. 4–6]. Абарона дысертацыі прайшла паспяхова, а І. Гутараў як удзельнік вайны хутка заняў высокія пазіцыі ў структуры Акадэміі навук[1].

Аднак нават на тагачасным узроўні развіцця тэорыі фальклярыстычных даследаванняў крытыкі адзначалі недахоп метадалагічнай базы ў яго працах. У рэцэнзіі К. Крапівы напісана, што І. Гутараў «з некаторай пагардай ставіцца да дакументацыі і пашпартызацыі матэрыялу… падае партызанскія частушкі і песні, не паказваючы, калі і ад каго яны запісаны… З мовай фальклорных твораў тав. Гутараў абыходзіцца досыць вольна. Ён, напрыклад, падае некаторыя песні і частушкі з іншых моў у вольным перакладзе на рускую мову і не адзначае, што гэта пераклад… Гутараў робіць няправільны вывад, што пашпартызацыя наогул непатрэбна» [8, л. 16].

Праблема пашпартызацыі не магла быць вырашана паслядоўна, бо ў збіранне фальклорных матэрыялаў уключаліся людзі з розным узроўнем падрыхтоўкі і матывацыі. У справаздачы старшага метадыста РДНТ А. Усава аб рабоце «па лініі фальклору» за першае паўгоддзе 1950 г. чытаем, што ўстанова наогул не мае ў сваім штаце адпаведнага спецыяліста. Наспела праблема «рэалізацыі» – публікацыі сабранага матэрыялу ці выкарыстання яго ў культурнай дзейнасці. Мноства прыпевак, вершаў, якія адпавядаюць патрабаванням савецкага друку, ляжаць без руху ў рэдакцыі газеты «Сталинская молодежь»[2] і ў бібліятэцы ўстановы. «Калгаснікі, рабочыя, служачыя, прадстаўнікі савецкай інтэлігенцыі, вучні, студэнты ВНУ і тэхнікумаў, ахопленыя высакародным творчым парывам, шлюць нам свае творы, у якіх апяваюць поспехі

[1] У 1949 г. І. Гутараў ужо доктар філалагічных навук, прафесар, з 1953 г. – член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР. У 1951–1957 гг. працуе загадчыкам кафедры беларускай літаратуры ў БДУ, у 1957–1967 гг. загадвае сектарам фальклору ІМЭФ.

[2] У чэрвені 1956 г. газета «Сталинская молодежь» перайменаваная ў газету «Знамя юности».

і дасягненні савецкіх людзей, перамогу жыцця сталінскай эпохі» [6, л. 238], аднак яны застаюцца не запатрабаванымі.

У 1950 г. часопіс «Вопросы истории» (№ 8) паведамляе, што беларускія навукоўцы запланавалі падрыхтоўку трохтомнага выдання – «Материалы по фольклору Великой Отечественной войны», у якім меркавалася прадставіць вынікі штогадовых фальклорных экспедыцый у розныя вобласці БССР, пачынаючы з 1945 г. Аднак практыка паказала, што менавіта нездавальняючая якасць атрыманых экспедыцыйных матэрыялаў стала прычынай спынення работы ў гэтым кірунку [3, с. 146].

У 1957 г. на базе сектара этнаграфіі і фальклору Інстытута гісторыі і сектара мастацтва Інстытута літаратуры створаны Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР (*далей* – ІМЭФ), яго першым дырэктарам становіцца акадэмік АН БССР П. Глебка. З гэтага часу ІМЭФ паступова робіцца навуковым цэнтрам у справе збірання і публікацыі фальклорных матэрыялаў. Менавіта акадэмік П. Глебка, паводле ацэнкі А. Фядосіка, робіць значны ўнёсак у станаўленне палявой фальклярыстыкі [4, с. 41].

Але і аматарскае збіранне фальклору ў гэты час застаецца пашыранай культурніцкай практыкай: сшыткі з народнай песняй сустракаюцца ў многіх загадчыкаў сельскіх клубаў і хат-чытальняў [5, с. 3]. Акрамя экспедыцый, праца беларускіх фалькларыстаў развівалася ў накірунках падрыхтоўкі жанравых і тэматычных зборнікаў, фундаментальнага зводу БНТ. Усё больш актуальнай рабілася распрацоўка тэорыі традыцыйнай культуры беларусаў.

28–29 красавіка 1960 г. у АН БССР адбылася вялікая Рэспубліканская нарада па пытаннях каардынацыі збірання і даследавання беларускага фальклору. У дакладзе акадэміка П. Глебкі гучала: «На карце фальклорных абследаванняў Беларусі нямала яшчэ ёсць белых плям. Ёсць тэрыторыі, на якія не ступала яшчэ нага збіральніка. Далёка не ўвесь і сабраны ў Беларусі фальклор пушчан у навуковы абыходак і да гэтага часу ляжыць мёртвым грузам у архіўных сховішчах». Ён ставіў перад фалькларыстамі рэспублікі маштабную задачу «паслядоўна абследаваць усю тэрыторыю Беларусі, выявіць і запісаць некранутыя скарбы народнай творчасці, аддаючы пры гэтым асаблівую ўвагу сучаснаму фальклору» [1, с. 4]. Аб арганізацыі збіральніцкай працы ў сістэме вышэйшай школы БССР на нарадзе дакладалі Л. Мухарынская, В. Тарасаў, П. Ахрыменка, У. Калеснік, М. Янкоўскі. Грунтоўная распрацоўка методыкі збірання вусна-паэтычнай творчасці была прадстаўлена К. Кабашнікавым, методыка запісу народнага меласу – В. Ялатавым. У дакладзе аб стратэгіях збірання фальклору М. Грынблат, які з'яўляўся адным з самых вопытных палявікоў, прыводзіў у прыклад працу Інстытута мовазнаўства па складанні Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы, падчас якой за параўнальна кароткі тэрмін, каля 10 год, навукоўцы здолелі абследаваць гаворкі па ўсёй тэрыторыі Беларусі і сабраць надзвычай багаты матэрыял [1, с. 35]. План экспедыцыйных работ фалькларыстаў па кожнай вобласці, адзначаў выступоўца, павінен улічваць узровень абследаванасці раёна, «кусты» суседніх раёнаў, якія вызначаюцца агульнасцю паасобных з'яў абрадавай культуры і выканальніцкага стылю, межы абласцей і раёнаў БССР суадносна з межамі былых паветаў і губерняў. М. Грынблат звяртаў увагу на тое, што пры планаванні экспедыцыйнай работы неабходна ўлічваць сацыяльна-гістарычную спецыфіку рэгіёна, напрыклад, партызанскі фальклор запісваць найперш у раёнах былых партызанскіх зон, стары шахцёрскі фальклор трэба шукаць на Магілёўшчыне, адкуль насельніцтва масава наймалася ў шахты Данбасу, і інш. [1, с. 37–38].

Нарада даказала, што ў 1960 г. акадэмічнае асяроддзе ўсведамляла: работа па збіранні беларускай народнай творчасці павінна ажыццяўляцца як справа развіцця нацыянальнай культуры і народнага мастацтва – маштабна, усенародна, з энтузіязмам. Яе трэба каардынаваць з ВНУ, Саюзам кампазітараў, структурамі Дамоў народнай творчасці, раённых краязнаўчых музеяў і іншых устаноў.

З 1960-х гг. навуковая думка паступова пайшла па шляху пераадолення ідэалагічных установак эпохі культу асобы, абнаўлення метадалогіі і пошуку новых каштоўнасных арыенціраў. Аднак перабудова навукова-даследчай тэматыкі інстытута ў святле рашэнняў XXII з'езда КПСС (кастрычнік 1961 г.) прывяла да «перафарматавання» задач фалькларыстаў у кантэксце новай ідэалагічнай парадыгмы. На 1962 г. у ІМЭФ запланавана падрыхтоўка зборнікаў «Современный белорусский фольклор», «Образ Ленина и КПСС в белорусском фольклоре», манаграфіі «Народное творчество в докладах и выступлениях Н. С. Хрущева» і інш. [7, л. 50].

Экспедыцыйная дзейнасць у гэты час застаецца найважнейшай формай работы беларускіх фалькларыстаў. У 1960-я гг. на старонках «Літаратуры і мастацтва» рэгулярна публікуюцца матэрыялы пра экспедыцыі ІМЭФ ва ўсе рэгіёны Беларусі. Летам 1960 г. у Нясвіжскім і Капыльскім раёнах навукоўцы зафіксавалі варыянты народнай драмы «Цар Максіміліян». Паведамляецца, што паказы батлейкі ладзіліся ў в. Бялевічы Слуцкага раёна «практычна да нядаўняга часу». У 1961 г. «збіральнікі народных песень, легенд, прыказак і прымавак пабывалі ў дзевяці вёсках Мінскай і Віцебскай абласцей, зрабілі звыш 650 цікавых запісаў», у тым ліку арыгінальныя варыянты сямейна-абрадавых песень (ЛіМ, 1961, 14 ліпеня). У 1962 г. М. Грынблат, З. Мажэйка і Г. Антонаў у экспедыцыях на Гродзеншчыну і Гомельшчыну зрабілі 850 запісаў. Летам 1963 г. навуковыя супрацоўнікі сектара фальклору ІМЭФ на працягу трыццаці дзён абследавалі гарады і вёскі Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай і Брэсцкай абласцей. На Палессі працавала экспедыцыя Інстытута славяназнаўства Акадэміі навук СССР пад кіраўніцтвам М. Талстога (ЛіМ, 1963, 6 жніўня). Такім чынам, у 1945–1960-я гг. закладзены асновы ўнікальнага фонду экспедыцыйных матэрыялаў, якія сёння ўваходзяць у найбуйнейшую ў Беларусі фальклорную калекцыю ІМЭФ.

У масавай культуры і сацыяльнай практыцы здабыткі даследчыкаў народнай культуры былі засвоены толькі на фармальна-зместавым узроўні, перавага аддавалася захаванню традыцыяналізму і ідэалагічнага адзінства савецкага мастацтва. У 1960 г. К. Кабашнікаў піша: «На жаль, мы маглі пераканацца і ў тым, што ў рабоце многіх сельскіх клубаў і асобных раённых дамоў культуры значэнне народнай творчасці амаль не ўлічваецца. Часта рэпертуар самадзейных калектываў складаецца з твораў, якія даўно вядомы і шмат разоў выконваліся. Праграмы канцэртаў паўтараюць адна адну, таму што бяруцца яны з адных і тых жа, не вельмі багатых рэпертуарных зборнікаў, якія выдаюцца ў Маскве. На нашу думку, рэпертуарныя зборнікі неабходна рэгулярна выдаваць і ў Мінску. Рэспубліканскі Дом народнай творчасці ў садружнасці з Саюзам кампазітараў і Саюзам пісьменнікаў БССР павінен паклапаціцца аб прапагандзе лепшых узораў народнай творчасці» [2, с. 1]. Магчымасці выдаваць матэрыялы экспедыцый ІМЭФ і калекцыі асобных збіральнікаў, піша К. Кабашнікаў, застаюцца абмежаванымі.

Такім чынам, установка на народную творчасць, дэкларававаная ў савецкай навуцы і культурнай практыцы яшчэ ў 1930-я гг. і развітая ў 1945–1960-я гг., была ідэалагічна дэтэрмінавана неабходнасцю канструявання і легітымізацыі новай савецкай

ідэнтычнасці. Яе рэалізацыя выходзіла далёка за межы акадэмічнай навукі і яе задач і абапіралася на шырокую сацыяльную базу. На этапе назапашвання эмпірычнага матэрыялу ўстаноўка на народную творчасць была даволі прадуктыўнай, яна выклікала ў грамадстве энтузіязм і спарадзіла адпаведныя формы камунікацыі рознага ўзроўню. Аднак тэарэтычнае асэнсаванне гэтага матэрыялу замаруджвалі сацыяльныя фактары, а спробы імплементаваць здабыткі беларускіх фалькларыстаў у культурны дыскурс савецкай краіны выяўлялі разрыў паміж дэклараваным мастацтвам новай эпохі і традыцыйнай культурай.

## Літаратура

1. Інструктыўныя і метадычныя матэрыялы па збіранню і вывучэнню беларускага фальклору / ІМЭФ, пад рэд. С. К. Майхровіча. Мінск. Выд. АН БССР, 1961. 59 с.
2. *Кабашнікаў К.* Запісана ў Мінскай вобласці… ЛіМ, 1960, 9 верасня. С. 1.
3. *Фядосік А. С.* Беларуская савецкая фалькларыстыка. Мінск. Навука і тэхніка. 1987. 348 с.
4. *Фядосік А. С.* Развіццё беларускай савецкай фалькларыстыкі. Мінск. Навука і тэхніка. 1977. 85 с.
5. *Ялатаў В.* Збіральнікі скарбаў фальклору. Літаратура і мастацтва. 1959. 28 лістапада. С. 3
6. БДМАЛМ. Ф. 79. Вопіс 1. Справа 75. Лістоў 347.
7. НАРБ. Ф. 4. Опись 73. Дело 219. Листов 150.
8. НАРБ. Ф. 205, Опись 10. Дело 200. Листов 49.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 30.09.2019.*